*барвовы. // У адрыны, хлявы, катухі // Пруцца гусі, авечкі, каровы»* [4, с. 6]. У вершы відавочная ўбываючая градацыя праз назвы будынкаў: *адрына* ‘вялікі будынак для захоўвання сена’, далей *хлеў* ‘памяшканне для свойскіх жывёл’, *катух* ‘маленькі хлеў або адгароджанае месца ў хляве’.

Выкарыстанне пісьменнікам градацыі робіць успрыманне мастацкага твора шматпланавым, выклікае цікавасць у чытачоў, дапамагае глыбей пранікнуць у сэнс выказвання, нараджае багатыя вобразныя асацыяцыі.

Такім чынам, нелакалізаваныя фігуры паўтору, якія Л. В. Дранько-Майсюк актыўна выкарыстоўвае ў сваіх паэтычных творах, садзейнічаюць актуалізацыі семантыкі паўтораных лексічных адзінак, узбагачаюць змест твораў, спрыяюць слоўнай вобразнасці, эмацыянальнасці і выразнасці, арыгінальнасці і непаўторнасці паэтычнага маўлення.

**Літаратура**


1 Дранько-Майсюк, Л. Вершы, паэмы, эсэ / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 214 с.

2 Дранько-Майсюк, Л. Акропаль // Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 190 с.

3 Дранько-Майсюк, Л. / Над пляцам: вершы / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 86 с.

4 Дранько-Майсюк, Л. / Вандроўнік: вершы. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 47 с.

5 Дранько-Майсюк, Л. Гаспода: выбранае. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 382 с.

6 Станкевіч, А. А. Лінгвістычны аналіз тэксту: вучэбны дапаможнік / А. А. Станкевіч; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Францыска Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2018. – 198 с.

7 Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў: дапаможнік для настаўнікаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск : Нар. асвета, 1983. – 191 с.



**УДК 821.161.3-3**



***М. С. Язерская***


## НАВУКОВАЕ АСЭНСАВАННЕ ПЛЫНІ ЧАСУ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ХРОНАФАНТАСТЫЦЫ


*У артыкуле аналізуюцца навуковыя тэорыі, прысвечаныя асэнсаванню плыні часу, і іх функцыі ў мастацкіх тэкстах на прыкладзе твораў «Пятая цэнтурыя, трыццаць другі катрэн» Ю. Станкевіча, «Аўтобус» В. Гапеева і «Дзевяць жыццяў Віта Морэ» (частка «Дзізаз») К. Стасялькі. Аўтар прыходзіць да высновы, што ўсе тры творы належаць да жанру філасофскай хронафантастыкі. Героі В. Гапеева ўспрымаюць час як небяспечную з’яву, а героі К. Стасялькі бачаць у ім вялікія магчымасці для чалавека і робяць усе дзеля таго, каб карыстацца імі ў поўнай меры.*


Час і прастора з’яўляюцца важнымі кампанентамі мастацкага свету твора і маюць адметныя якасці ў рэалістычных тэкстах і ў фантастыцы. У яе межах вылучаецца жанр хронафантастыкі, які ўжо сваёй назвай указвае на суаднесенасць з феноменам часу. «Хронафантастыка (ці інакш «тэмпаральная фантастыка») – гэта адзін з жанраў фантастыкі, які распавядае пра падарожжа ў часе» [1], – адзначае Б. Неўскі. Вылучаюць наступныя спосабы такога перамяшчэння:



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– з дапамогай машыны часу – прылады, «якая стварае замкнёныя часавыя крывыя – і, такім чынам, дазваляе падарожнічаць у часе – там, дзе інакш нічога не існавала б» [2]). Пад машынай часу можа разумецца непасрэдна машына, ровар, гадзіннік або рулетка, з дапамогай якіх можна апынуцца ў будучым ці мінулым, пры гэтым адлічыўшы дакладны прамежак часу, у які трэба трапіць;

– перамяшчэнне пры дапамозе прыродных анамалій (падчас навальніцы, сейсмічнай актыўнасці і пад.);

– падарожжа ў часе з дапамогай здольнасцей саміх герояў ці магіі.

«Пятая цэнтурыя, трыццаць другі катрэн» Ю. Станкевіча – захапляльны раман, які вабіць чытача матывамі падарожжаў у часе. Пісьменнік складае даволі сціслы па аб'ёме сюжэта твор, які мае яскравы акцэнт на фантастычным пачатку. Над мегаполісам, што нагадвае сталічны Мінск, завісае гелікаптар, якім кіруюць нейкія істоты-клоны (магчыма, іншапланецяне ці прышэльцы з будучыні). Праз такі сюжэт аўтар імкнецца перадаць уласныя погляды на магчымае стварэнне Сусвету, на катэгорыі часу і прасторы.

Прышэльцы, або «людзі ў чорным», губляюць хранальны сінтэзатар, які выпадкова трапляе да людзей: «Хранальны сінтэзатар, цікава, цікава… А вы ведаеце – магчыма, вы з'яўляецеся ўладальнікам унікальнейшай рэчы, з яе дапамогай зможаце вандраваць у часе, станеце празорцам, ха-ха…» [3, с. 104].

Носьбітам аўтарскай пазіцыі ў творы з'яўляецца філосаф Зайцаў. Менавіта з яго вуснаў гучаць ідэі пра версіі паходжання Сусвету, пра «клонаў-прышэльцаў», пра магчымую віртуальнасць нашага свету. Яны падмацоўваюцца каментарыем самога пісьменніка, які праз «дакументальныя» ўстаўкі падае навуковыя азначэнні тэрмінаў, сведчыць пра нейкі зафіксаваны выпадак з гісторыі чалавецтва або знаёміць чытача з тым ці іншым навукоўцам. Асэнсоўвае аўтар і феномен часу, распавядаючы пра тэорыю Альберта Вейніка: «Мы з'яўляемся прадстаўнікамі хранальна-метрычнага свету, – лічыць ён, – таму нам цяжка ўявіць сабе аб'екты, якія не ўтрымліваюць хранальнага рэчыва. Тыя аб'екты, што не маюць памераў і масы, могуць уладкоўвацца ў наш хранальна-метрычны свет па прынцыпу "размазвання"» [3, с. 176–177].

Да таго ж, адпаведна з сучаснымі адкрыццямі ў сферы нанатэхналогій, Ю. Станкевіч атаясамлівае чалавецтва і гісторыю яго існавання з камп'ютарнай сімуляцыяй: «"Сусвет – гэта лабараторная звышпрабірка для эксперыментаў Вышэйшых Сіл", – так гучыць выснова філосафа Зайцава» [3, с. 229]. Твор мае філасофскі характар, бо ў цэнтры яго роздум пра асновы светаўладкавання, сучаснасць і будучыню як часавыя катэгорыі і пра ролю навуковых ідэй у развіцці чалавецтва.

Яшчэ адным цікавым з пункта погляду асэнсавання феномена часу творам стаў «Аўтобус» В. Гапеева. Апавяданне грунтуецца на выкліканай храналагічнымі парушэннямі незвычайнай сітуацыі, на падставе якой даецца навуковае тлумачэнне катэгорыі часу і яго якасцям. Пасажыры, якія апынуліся ў салоне аўтобуса, заўважаюць, што ў працэсе руху транспартнага сродку па маршруце нешта пайшло не так. Аўтобус не спыняецца на прыпынках, згодна з раскладам, і гэта здзіўляе аднаго з герояў: «Э-е-е,– павярнуўся да салона хударлявы і лысы малады чалавек, на каленях якога ляжаў уключаны ноўтбук. – Міма гэтага павароту мы праязджалі! Чорт... Зараз будзе бярозка са зламанай вяршыняй справа!» [4, с. 172]. З гэтага моманту пачынаюць хваляваяцца і іншыя пасажыры, якія заўважылі скажэнні не толькі ў прасторы, але і ў часе:

«– Толькі што час на маніторы пераскочыў на 10 хвілін назад. Я зірнуў – мы едзем там, дзе і раней былі якраз 10 хвілін таму. <…> Я думаю, апошні ўдар перуна прыйшоўся на лінію перадач, узнікла моцнае электрамагнітнае поле і мы патрапілі ў кальцо прасторы-часу, якое якраз утварылася. І круцімся ў ім...

– Калі б мы ў кольцы былі, то б ад пачатку пачалі размаўляць, – устрэў Антось, якому такое тлумачэнне здалося неверагодным. – Лухта нейкая...» [4, с. 173].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Аднак мужчына з камп’ютарам спрабуе навукова патлумачыць такія дзівосы: «Поле дзейнічае на фізічную мёртвую матэрыю. Вось, час пераскочыў, курыца аднавілася... Калі Вы можаце патлумачыць па-іншаму, чаму мы ўжо тройчы едзем адным адрэзкам – патлумачце. І зірніце на гадзіннікі...» [4, с. 173]. Пасажыры ўпэўнены ў ірэальнасці таго, што адбываецца: адна з жанчын нават прыняла такое здарэнне за суд Божы. Падарожнікі імкнуцца спыніць аўтобус, проста адчыніўшы дзверы, спрабуюць тэарэтычна абгрунтаваць свае здагадкі: «Мы патрапілі ў кольца часу, рухаючыся, мы застаёмся ў ім і рухаемся... Можа, мы і застаёмся тут толькі таму, што самі рухаемся...» [4, с. 175].

Аднак «эксперымент» з павольным спыненнем не дапамог пасажырам, а зрабіў толькі горш – яны сталі рухацца яшчэ хутчэй, што прыводзіць да панікі. У хуткім часе героі прыходзяць да высновы, што фізічнае цела не можа рухацца з такой хуткасцю ў часе, а гэта значыць, што ў выніку ўсе, хто сядзіць у салоне аўтобуса, павінны проста знікнуць. Іншымі словамі, героі рухаюцца па коле часу і выйсце з яго толькі адно: выскачыць з аўтобуса ці знікнуць. З гэтым становішчам не хочуць мірыцца жанчына, якая вязе грошы на лячэнне дачкі, галоўны герой Антось і маленькі хлопчык-інвалід, які нейкім цудам падняўся з інваліднага вазка. Усе яны вырашаюць выскачыць на хаду, перад наканаванасцю смерці і невядомасцю наступстваў такога ўчынку (а раптам выжывуць?) выбіраюць апошняе.

Фінал твора пададзены дакументальна: «З паведамленняў у СМІ: “Пярун патрапіў у аўтобус. Трагедыя адбылася на трасе ў 11:25. Магутны разрад маланкі патрапіў у пасажырскі аўтобус. Відавочцы бачылі, як той літаральна асвяціўся блакітным полымем, потым з’ехаў па поўнай хуткасці з трасы і тройчы перакуліўся. З 18 пасажыраў аўтобуса і яго вадзіцеля ў жывых засталося толькі трое пасажыраў: малады мужчына, жанчына і хлопчык-інвалід, якіх невядомым чынам выкінула з аўтобуса – іх целы былі знойдзеныя у некалькіх метрах побач. Цяпер яны ў рэанімацыі. Медыкі кажуць аб іх цяжкім, але ўстойлівым стане. Пра іх далейшы лёс мы праінфармуем сваіх чытачоў”» [4, с. 186]. Як бачым, В. Гапееў даволі арыгінальна раскрывае эфект пятлі часу, у які трапляюць героі пад уздзеяннем прыродных анамалій (удару маланкі), спрабуючы асэнсаваць феномен часу, яго сувязь з рухам у прасторы з пазіцыі псіхалогіі чалавека і магчымых фізічных зменаў яго цела.

Кожны раздзел рамана «Дзевяць жыццяў Віта Морэ» ўяўляе сабой асобны адносна скончаны твор з уласнай філасофскай канцэпцыяй, усе яны напісаны ў розных жанрах, але аб’яднаны адным героем – Віта Морэ. У частцы «Дзізаз» галоўны герой з’яўляецца жыхаром іншай планеты, больш развітай цывілізацыі і становіцца вучнем Красмуса, задача якога – пазнаёміць Віта Морэ (а разам з ім і чытача) з тэорыяй прасторы-часу. Акрамя ведаў пра двухмерную і трохмерную прастору Віта даведваецца пра магчымасці Дзізаза, што дазваляе падарожнічаць у прасторы-часе: «Перамяшчэнне ў прасторы-часе патрабуе дэматэрыялізацыі. На дадзеным этапе развіцця стакірцы пакуль не навучыліся гэта рабіць самастойна і па ўласным жаданні без тэхнічных прыстасаванняў. Пакуль мы выкарыстоўваем зіктар, які прымяняюць выключна ў фракцыях аднаўлення і развіцця. Таму ўсё залежыць ад таго, у якую фракцыю, сектар на які ўзровень цябе ў далейшым размяркуюць» [5, с. 55]. Цяпер задачай галоўнага героя становіцца набыццё ведаў, каб яго Дзізас дасягнуў такога ўзроўню, пры якім ён бы мог перамясціцца ў прасторы-часе самастойна.

Навуковыя тэорыі ўкладзены ў вусны Красмуса: «На дадзены момант стакірцам вядомыя два спосабы перамяшчэння ў прасторы-часе: дасягнуць хуткасці, якая б перавышала хуткасць святла, або пасродкам так званых кратовых нораў. Аднак маюцца некаторыя нюансы. Для таго каб разагнаць хаця б да хуткасці святла невялікі прадмет, патрабуюцца вялізныя затраты энергіі. Тое ж самае і ў выпадку кантраляваных кратовых нораў. З гэтай прычыны для падарожжаў выкарыстоўваюцца зіктары –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыстасаванні, якія дазваляюць дэматэрыялізаваць аб’екты любой велічыні» [5, с. 56]. Тэорыя адноснасці дапускае магчымасць існавання «Кротавых нор», пад чым разумеецца нешта накшталт тунэляў (можа быць і вельмі кароткіх), якія злучаюць далёкія кропкі прасторы. Распрацоўваючы тэорыю Кратовых нор, К. Торн і М. Морыс заўважылі, што, калі перамяшчаць адзін канец «А» кароткай нары з вялікай хуткасцю, а потым наблізіць яго да іншага канца «Б», то аб’ект, які трапіў у момант часу «Т» ва ўваход «А», можа выйсці з «Б» у момант, які папярэднічае «Т» (аднак такім спосабам немагчыма патрапіць у час, ранейшы за час стварэння машыны часу).

Такія падарожжы дораць неверагодныя адчуванні галоўнаму герою, вастрыні ім дадаюць сустрэчы Віта з рознымі версіямі самога сябе ў кожным вымярэнні. Час у творы К. Стаселькі можа падпарадкавацца чалавеку, калі той правільна скарыстаецца сваімі здольнасцямі. Цікавы сюжэт дапамагае пісьменніку паразважаць пра навуковыя ўяўленні будучага (дэматэрыялізацыю) і магчымасць вандровак у прасторы-часе, заяўленую ў сённяшняй тэорыі адноснасці.

Такім чынам, творы «Пятая цэнтурыя, трыццаць другі катрэн» Ю. Станкевіча, «Аўтобус» В. Гапеева і «Дзевяць жыццяў Віта Морэ» (частка «Дзізаз») К. Стаселькі належаць да жанру філасофскай хронафантастыкі. У кожным з іх падаюцца прысвечаныя асэнсаванню плыні часу навуковыя тэорыі, праз якія аўтары раскрываюць важныя праблемы: будучыні зямной цывілізацыі, сістэмы каштоўнасцей, сэнсу чалавечага жыцця і інш. Калі ў К. Стаселькі і В. Гапеева такія тэорыі агучваюцца вуснамі персанажаў, то ў рамане Ю. Станкевіча ў дадатак выкарыстоўваюцца адмысловыя «дакументальныя» ўстаўкі. Ва ўсіх трох тэкстах прысутнічае матыў падарожжаў у часе з дапамогай розных спосабаў: прылады («Пятая цэнтурыя, трыццаць другі катрэн», «Дзевяць жыццяў Віта Морэ»), прыродных анамалій («Аўтобус»), чалавечых звышмагчымасцей («Дзевяць жыццяў Віта Морэ»). Героі В. Гапеева ўспрымаюць час як небяспечную з’яву, што можа імгненна знікнуць ці закальцавацца і прывядзе да знішчэння іх саміх, а героі К. Стаселькі, наадварот, бачаць у ім вялікія магчымасці для чалавека і робяць усе дзеля таго, каб карыстацца імі ў поўнай меры.

**Літаратура**

1 Невский, Б. Хроноопера. Фантастика о путешествии во времени [Электронный ресурс] / Б. Невский. – Режим доступа : old.mirf.ru/Articles/print856.htm. – Дата доступа : 19.12.2020 г.

2 Стэнфардская навуковая энцыклапедыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://plato.stanford.edu/entries/time-machine/. – Дата доступу : 19.12.2020 г.

3 Станкевіч, Ю. Апладненне ёлупа: раманы, аповесці, апавяданні / Юры Станкевіч. – Мінск : Рэд. газ. «Настаўн. газ.» 2005. – 560 с.

4 Гапееў, В. М. Я размалюю для цябе неба: Аповесць, п’еса, апавяданні: Рэальнасць, містыка, фантастыка / Валеры Гапееў. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 222 с.

5 Стаселька, К. Дзевяць жыццяў Віта Морэ: раман / Кірыл Стаселька. – Мінск : Галіяфы. – 2019. – 356 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ